# Мастацкая вобразнасць і індывідуальны падыход

## майстроў лапікавага шыцця Беларусі і Латвіі

**У старажытныя часы людзі беражліва ставіліся да тканіны. Пасля пашыву адзення, прадметаў бытавога выкарыстання — штор, абрусаў, покрываў — збіралі і захоўвалі маленькія абрэзкі. У выніку з іх стваралі новыя арыгінальныя рэчы. З часам такія маніпуляцыі з палатном пачалі называцца тэхнікай лапікавага шыцця.**

Лапікавае шыццё заўсёды з'яўлялася элітным відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Нават царскія сем'і займаліся ім. Пасаг нявесты лічылі добрым, калі коўдры, падрыхтаваныя бацькамі, складаліся з вялікай колькасці кавалачкаў тканіны, а хата, дзе на сценах віселі дываны з дарагіх кавалачкаў матэрыі, была багатай. Сёння лапікавае шыццё ператварылася хутчэй у хобі і атрымала сучасныя, тэндэнцыйныя назвы: абрэзкавая мазаіка, заплатка, пэчворк, квілт. Апошнія замежныя словы няёмка гучаць датычна беларускага майстэрства, прыметнік «лапікавае» падыходзіць больш.

У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» прадстаўлены Міжнародны дабрачынны праект «Трыкатажныя куплеты — 2016». У аснове экспазіцыі — лапікавыя пано беларускіх і латвійскіх аўтараў. Работы латвійцаў прадстаўлены ў мінімальнай колькасці, вялікую плошчу выставачнай прасторы занялі беларускія кампазіцыі.



*З адкрыцця выстаўкі «Трыкатажныя куплеты — 2016».*

Тэхніка лапікавага шыцця — не проста вытанчаны від рукадзелля, у якім па прынцыпе мазаікі ствараецца цэльны твор з кавалачкаў рознай па якасці тканіны. Гэта асобны від майстэрства, у якім фантазія і спрытнасць рук займаюць першае месца. Здзіўляе, што са звычайных, непатрэбных для побытавага ўжывання рэшткаў матэрыі ствараецца эксклюзіўнае аўтарскае палатно, выкананае ў індывідуальнай стылістыцы, з новым каляровым афармленнем, узорамі і фактурай.

На выстаўцы экспануюцца непаўторныя кампазіцыі, якія ўражваюць не колькасцю дробязных дэталяў, а самабытнасцю, нестандартнасцю мастацкіх ідэй. Беларускія майстрыхі звяртаюцца да сюжэтаў роднага краю, іх прываблівае асяроддзе, мясцовая прырода: палявыя пейзажы, яркія кветкі і вобразнасць вячэрніх гарадоў. Латвійскае шыццё таксама падкрэслена сюжэтамі родных краявідаў, дзе ўражаны глядач у думках можа прагуляцца па Рыжскім узмор'і. Латвійцаў цікавіць і тэма традыцый Усходу, вобразнасць яго народаў і непадобнасць да культуры іншых краін. Праглядаючы мастацкія пано, дзівішся, наколькі гэта працаёмкі, карпатлівы працэс — камбінаваць мноства тканых матэрыялаў, сумяшчаць розныя тэхнікі шыцця і сучасныя віды апрацоўкі тканіны.



*Святлана Кузняцова «Гарадскія кветкі» (Беларусь).*

Выстаўка «Трыкатажныя куплеты — 2016» арганізавана ў выніку ўдзелу беларускіх аўтараў у разнастайных рэспубліканскіх, міжнародных конкурсах і творчых сустрэчах, дзе яны неаднаразова станавіліся пераможцамі. Прадстаўлены праект задуманы як дабрачынны. Спачатку аматары мастацтва змогуць пазнаёміцца з кампазіцыямі творцаў у розных беларускіх гарадах. Пасля экспанаты перададуць у дзіцячыя дамы. На адкрыцці выстаўкі ўсіх зацікаўленых тэхнікай лапікавага шыцця беларускія майстрыхі запрасілі далучыцца да творчасці: кожны тыдзень ладзяцца сустрэчы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

**Вікторыя АСКЕРА,**
**фота аўтара**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ